АФІЦЫЙНА

У НАС НОВЫЯ КАЛЕГІ

Рашэннем Прэзідыума Грамадскага аб’яднання «Саюз пісьменнікаў Беларусі» ад 29 верасня 2026 года ў шэрагі рэспубліканскай пісьменніцкай арганізацыі (Гродзенскае абласное аддзяленне) прынятыя гродзенская паэтэса, публіцыст Юлія МЕЛЬНІК і краязнаўца з Ліды, пісьменніца-педагог Наталля АНАШКЕВІЧ.



Юлія МЕЛЬНІК (Раманюк Юлія Віктараўна)

Раманюк (Мельнік) Юлія Віктараўна нарадзілася 13 жніўня 1980 года ў горадзе Пінску Брэсцкай вобласці, у сям’і служачых. Скончыла філалагічны факультэт Брэсцкага дзяржаўнага ўніверсітэта імя А. С. Пушкіна (спецыяльнасці «руская мова і літаратура», «беларуская мова і літаратура»); юрыдычны факультэт Гродзенскага дзяржаўнага ўніверсітэта імя Янкі Купалы па спецыяльнасці «юрыст»; магістратуру па спецыяльнасці «юрыспрудэнцыя», атрымала ступень магістра юрыдычных навук. Працавала школьным настаўнікам рускай мовы і літаратуры; у судзе Кастрычніцкага р-на г. Гродна (сакратаром суда канцылярыі

па крымінальных справах, загадчыцай канцылярыі па адміністрацыйных справах і выканаўчых вытворчасцях). У цяперашні час нясе службу ў Гродзенскай рэгіянальнай мытні ў званні інспектара мытнай службы I рангу.

Дэбют Юліі Мельнік у друку адбыўся ў 1998 годзе ў газеце «Полесская правда». Тады ж з удзелам Юліі выйшаў сюжэт на тэлеканале «Варяг». Асноўныя тэматычныя напрамкі творчасці паэтэсы – любоўная, філасофская, гарадская, патрыятычная лірыка. Двойчы пераможца Абласнога літаратурнага конкурсу рукапісаў імя Максіма Багдановіча: у намінацыі «Адкрыццё года» (2024) і ў намінацыі «Паэзія» (2026).

Лаўрэат і фіналіст міжнародных літаратурных конкурсаў Беларусі і Расіі ў намінацыях «Паэзія» і «Пераклады на беларускую мову». У прыватнасці, фіналіст конкурсаў «Беларусь-Россия. Сожские берега дружбы» ў намінацыі «Пераклады твораў Расула Гамзатава на беларускую мову» (2023); «Берега дружбы імя Л. Ю. Севера» (2024), IX літаратурнага конкурсу лірыка-патрыятычнай паэзіі імя Ігара Грыгор'ева (1923-1996), прысвечанага 80-годдзю Перамогі ў Вялікай Айчыннай вайне 1941-1945 гадоў «И память живая, бессонная, жгучая»; VIII Літаратурнага форуму «Цэнтр Еўропы» з міжнародным удзелам у намінацыях «Паэзія», «Победа отцов и дедов – это наша Победа» (2025). Лаўрэат III ступені міжнароднага літаратурнага конкурсу «Это нужно не мёртвым! Это надо – живым!» (2025), адкрытага літаратурнага конкурсу «З табой маё слова, Радзіма» ў намінацыі «Беларусь – міраносіца» (2026). Лаўрэат I ступені Міжнароднага літаратурнага конкурсу паэтычных перакладаў «Беларусь-Россия. Сожские берега дружбы» ў намінацыі «Пераклады твораў Мікалая Рубцова на беларускую мову» (2026). Аўтар пяці зборнікаў літаратурна-мастацкіх твораў: «Мой буревестник» (паэзія, 2024); «#ЛЮБОВЬНЕВОЙНА» (паэзія і проза, 2024); «На страже Родины» (публіцыстыка); «Откровения в лунном свете» (у суаўтарстве з Андрэем Татурам, паэзія, 2025); «Многоточия ночи» (паэзія, 2025). Кнігі пісьменніцы ў фармаце «друк па патрабаванні» можна набыць на папулярных маркетплэйсах. Мае публікацыі ў калектыўных зборніках і альманахах: «В завтра, словно в зеркало смотрю»; «Память огненных лет»; «И память живая бессонная, жгучая»; «На Нёманскай хвалі». Вершы публікуюцца ў часопісах: «Маладосць», «Полымя», «Нёман», «Новая Немига литературная», газеце «Літаратура і мастацтва». Юлія Віктараўна аўтар шэрагу публікацый у ведамасных перыядычных выданнях «Таможенный вестник», «Милицейский вестник», у рэгіянальных газетах, у выданні «СБ. Беларусь сегодня» – публіцыстычныя артыкулы пра людзей у пагонах, пра дзейнасць мытных органаў і іншых. Ю. В. Мельнік прымае актыўны ўдзел у творчых праектах і розных літаратурных мерапрыемствах абласнога, рэспубліканскага і міжнароднага ўзроўню. Творчы патэнцыял паэтэсы дынамічна развіваецца, і адпаведна мастацкі ўзровень яе твораў пастаянна расце.

Юлія Віктараўна – чалавек энергічны, камунікабельны, з прагрэсіўным мысленнем, сапраўдны патрыёт Беларусі і беларускай дзяржавы. Мае дапытлівы, крытычным розум, уважлівая да таго, што адбываецца ў навакольным свеце. Умее сябраваць і шанаваць сяброўства. Піша на рускай і беларускай мовах. Жыве ў горадзе Гродна.

***



АНАШКЕВІЧ Наталля Мікалаеўна

Анашкевіч Наталля Мікалаеўна нарадзілася 24 лютага 1977 года ў горадзе Ліда Гродзенскай вобласці. Скончыла філалагічны факультэт Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта (беларуска-рускае аддзяленне) па спецыяльнасці «Філолаг. Выкладчык беларускай і рускай моў і літаратуры». Працуе настаўнікам рускай мовы і літаратуры ў сярэдняй школе № 11 г. Ліды імя Н. І. Паповай.

З 2007 года пачала збіраць матэрыялы і даследаваць гісторыю праваслаўных храмаў Лідскага благачыння. Сабраны матэрыял стаў асновай для выдання ў 2021 годзе першай кнігі «Православные храмы Лидчины: история и современность». Першыя публікацыі, прысвечаныя родным вёскам (Баравічы і Дроздава Лідскага раёна), адбыліся ў «Лідскай газеце» ў 2011 годзе. За гэтыя гады артыкулы і нататкі друкаваліся ў газетах «Культура», «Зорка», «Настаўніцкая газета», «Літаратура і мастацтва», «Гродзенская праўда», «Дзяніца», «Лідская газета», часопісе «Лідскі летапісец». З 2013 года Н. М. Анашкевіч – у складзе Лідскага раённага літаратурнага аб’яднання «Суквецце». З красавіка 2021 года супрацоўнічае з дзіцячай газетай «Зорька», на старонках якой друкуюцца артыкулы пра цікавыя і пазнавальныя мерапрыемствы, сустрэчы, паездкі вучняў Наталлі Мікалаеўны. Вынікам супрацоўніцтва са

сродкамі масавай інфармацыі стала выданне дзвюх кніг: «В калейдоскопе школьных дней» (2022) і «Мои КЛАССные попутчики» (2024). У іх сабраны артыкулы аб жыцці класных калектываў за тыя гады, калі яна з'яўлялася класным кіраўніком. З 2005 года з'яўляецца кіраўніком секцыі «Руская філалогія» школьнага даследчага таварыства «Пошук», дзе займаецца з навучэнцамі даследчай дзейнасцю, у тым ліку і вывучэннем літаратурнага краязнаўства Лідчыны. З 2008 года займаецца даследаваннямі ў межах праваслаўнага, літаратурнага і гістарычнага краязнаўства. Аўтар звыш 50 даследчых прац. Традыцыйна прымае ўдзел у семінарах, канферэнцыях, чытаннях рознага ўзроўню. Пісьменніца з'яўляецца аўтарам пяці кніг: «Православные храмы Лидчины: история и современность» (2021); «В калейдоскопе школьных дней» (2022); «Герб города Лиды– историко-геральдический памятник Беларуси» (2023); «Мои классные попутчики» (2024); «Лида. Литературный код» (2026). Акрамя гэтага, Наталля Анашкевіч укладальнік двух паэтычных зборнікаў: «Паэтычнае суквецце Лідчыны» (2025) – на тэму паэта і паэзіі майстроў мастацкага слова Лідчыны (да XXXII Дня беларускага пісьменства ў горадзе Ліда), а таксама «У сузор'і Жанчыны» (2026) – да Года беларускай жанчыны.

Наталля Мікалаеўна Анашкевіч знаходзіцца ў пастаянным кантакце з дзецьмі, імкнецца выхоўваць і развіваць у юных суграмадзянах лепшыя чалавечыя якасці. Эфектыўна сумяшчае нялёгкую працу педагога з літаратурна-краязнаўчай дзейнасцю, робіць гэта з любоўю да слова, да культуры і гісторыі нашай Айчыны. Па характары мяккі, добразычлівы чалавек, па перакананнях – аптыміст. Піша на беларускай і рускай мовах. Жыве ў Лідзе.

Ад імя нашага калектыву сяброў-аднадумцаў шчыра віншуем Юлію Віктараўну Раманюк (Юлію Мельнік) і Наталлю Мікалаеўну Анашкевіч з гэтай падзеяй – афіцыйным уступленнем у шэрагі Гродзенскага абласнога аддзялення Саюза пісьменнікаў Беларусі, жадаем нашым новым калегам моцнага здароўя, невычэрпнай жыццёвай і творчай энергіі. Няхай гэты заваяваны рубеж стане пачаткам новага раздзела іх творчай біяграфіі і паслужыць стымулам для новых здзяйсненняў. А мы – іх калегі – заўсёды будзем побач, таму што ўсе разам мы – Саюз.

САЮЗ ПІСЬМЕННІКАЎ БЕЛАРУСІ
ГРОДЗЕНСКАЕ АБЛАСНОЕ АДДЗЯЛЕННЕ